Литература
1.Абай. Слова – назидания/ Абай (Ибрагим) Кунанбаев// Избранное. - М., 2006. С.9-129.
2.Ауэзов, Мухтар. Путь Абая /Мухтар Ауэзов. – Алма-Ата, 1987. Т.2.
3.Абай. Книга слов/Абай. – Алматы, 1993.
4.Поэзия народов СССР XIX – начала XX века // Библиотека всемирной литературы.– М., 1977. - Т.102..

## *Анцыповіч М.В.* «Адам бол» – імператыў у творчасці Абая

Абай Кунанбаеў – асветнік, грамадскі дзеяч, пачынальнік казахскай пісьмовай літаратуры ў сваіх канцэпцыях развіваў ідэі, якія бяруць свой пачатак у трактатах аль-Фарабі іва ўсѐй цюрскамоўнай філасофскай спадчыне. Працягваючы традыцыі ўсходняй філасофіі, якая праніклівую ўвагу ўдзяляла даследванню чалавечай душы, Абай стварыў сваѐ вучэнне аб чалавеку на аснове прынцыпа —Адам бол” (Будзь чалавекам), як універсальны імператыў, які звернуты да рода чалавечага ў цэлым, а не толькі да казахскага народа. —Адам бол” – хутчэй канкрэтная формула, чым абстрактны запавет, і ѐн скіраваны не толькі да другіх, але і як маральнае самавыхаванне, так як за чалавекам прызнаецца свабода дзейнічаць паводле сваѐй перакананасці. У адрозненні ад аль-Фарабі, Абай не ствараў філасофскія сістэмы, а канцэнтраваў сваю ўвагу на практычных задачах удасканальвання чалавека, разглядаў рэальны сэнс чалавечага жыцця. Гуманізм Абая ў тым, што ѐн не толькі сфармуляваў ідэю дасканалага чалавека, але і абазначыў суадносіны ідэала і рэальнасці. Ён разумеў, што ідэал і рэальнасць не заўсѐды супадаюць. Калі чалавек у ідэале – маральны ідзейнічае па свайму абавязку, то рэальны чалавек загразнуў ва ўсемагчымасных заганах. // Радасцей не зведаўшы зямных, // Распазнаць святло ці здатны вы ? // Выстаіць на халадах скразных той, хто не шкадуе галавы // [1, с. 74]. Практычна ўся паэзія Абая прасякнута філасофскімі медытацыямі. Але, вядома, філасофія не зусім падыходзіць да выражэння паэзіі, таму што яна разгортвае думку ў адзінай абстрактнай прасторы, без асобы, без сітуацыі. Таксама і ў адрозненні ад рэлігіі, якая заўсѐды звяртаецца да

супольнасці людзей, паэзія апялюе да асобы, нават там, дзе паэт гаворыць з натоўпам – ѐн гаворыць —асобна” з кожным з гэтага натоўпу. У сваѐй паэзіі праз —покін думкі” Абай стварае вобраз свету і толькі з гэтага малюнка выводзіць шлях да этыкі і ўсталявання пэўных каштоўнасцях. //Мае песні іслам праслаўляць не маглі, //Ні дракона, ні дзевы з касой да зямлі, //Я праклѐнаў радкамі не шлю дзядам, //Не псую маладых бяседай сваѐй, //Калі мова мая беднай бачыцца вам, //Зразумейце потым сэнс, стоены ў ѐй // [1, с. 62] Абай выкарыстоўвае розум не дзеля таго, кабператварыць паэзію ў філасофію, але каб мабілізаваць на аснове паэзіі ўсе сродкі рацыянальныя, ірацыянальныя, медытатыўныя, якія здольныя зрабіць з паэзіі вышэйшы паэтычна – філасофскі сінтэз.

Філасофія Абая з’яўляецца складнікам мастацкай і сэнсавай архітэктонікі паэзіі, якая праяўляецца як праз вобразы галоўных герояў, так і ў форме эсэ. Лейтматывам у творчасці Абая выступае філасофскае палажэнне: —мы ніколі не можам ведаць, што нам патрэбна, таму што жывѐм толькі адзін раз і не маем магчымасці параўноўваць нашае жыццѐ ні з мінулым існаваннем, не выправіць штосці ў будучыні."

Паэтычныя канцэпцыі Абая не супадаюць з канцэпцыямі падпарадкавання літаратуры агітацыйным, палітычным ці рэлігійным задачам. //Зірні ў Каран – там даўнія высновы // Адзеты ў верш квяціста – каляровы // Калі б не рыфмаў лад, не гучнасць строф, // Хто слухаў бы пракракаў, іх прамовы ? // [2, с. 92]. Значыць, без слова, без рыфмы не існуе рэлігія, вера ў Бога. Менавіта праз паэзію, мастацтва ствараюцца вобразы вечнасці, якія нясуць радасць і заспакаенне для чалавека.

Узнікае пытанне: ці ўкладваецца спадчына Абая ў вузкія стылѐвыя азначэнні? Падаецца, што найболей блізкім па пытанню аб літаратурным напрамку Абая – аднясенне яго да рамантызму ў шырокім разуменні гэтага тэрміна. Прынцып Абая гістарычнай і псіхалагічнай верагоднасці ўзнаўлення —духа эпохі” праз —народнасць і мясцовасць” не дапускае адлюстравання рэальнасці ў яе грамадска – гістарычнай абумоўленасці. Ён носіць больш абагулены, ўніверсальны характар. //Родзіч з родзічам сварыцца з-за драбязы. // Богам розум адняты, адчай слязы. //Ні адзінства, ні

веры, паўсюль разлад, //Стала меней тваіх табуноў у разы// [1, с. 19]. Адсюль скіраванасць у мінулае, наданне яму зместу спецыфічнага ўзора жыццеўладкавання і паводзін і жаданне аджывіць яго ў сучасным. Само звяртанне да памяці і імкненне —павярнуць” калектыўную памяць у патрэбнае рэчышча абумоўлены фактам выжывання народа. І гэта выразна прысутнічае ў паэзіі Абая. Для любой агульнасці важным з’яўляецца супастаўленне сваѐй самасці з самасцю другіх грамадстваў і высвятленне ступені падабенства і адрозненняў як механізмаў зберажэння і развіцця нацыянальнай самасвядомасці. І адначасова ў гэтым жа прытоена небяспека ў адмаўленні не ўжо аформленых і існуючых стандартаў нацыянальнай культуры, а магчымасць адмаўлення далейшага іх развіцця ў нацыянальнай форме. Паводле Рэнэ Дэкарта: – —Карысна мець пэўныя веды пра норавы розных народаў, каб разважлівей меркаваць пра свае ўласныя і не лічыць усѐ, што не супадае з прынятым у нашай краіне, бязглуздым і смешным, як робяць зазвычай людзі, якія нічога не бачылі. Але ж калі траціш занадта часу на падарожжы, то ўрэшце робішся чужы на радзіме, а калі надта цікавішся справамі мінулых часоў, то звычайна цалкам страчваеш абазнанасць у падзеях сучасных” [3, с. 11]. Менавіта дэкартаўская абачлівасць і ўласціва паэзіі Абая.

У мастацка – філасофскім светапаглядзе Абая прырода ў цэлым займае значнае месца і праяўляецца праз вертыкальнае і гарызантальнае вымярэнне. Вертыкаль (неба, горы і г. д.) уяўляе сабой шлях да Бога, а гарызанталь (раўніна, стэп і г. д.) – шлях да прагрэса. Адлюстраванне прыроды ў паэзіі Абая праходзіць праз рэлігійна – анталагічныя канатацыі. Калі ў хрысціянству галоўнае не яднанне з прыродай, а ўзвышэнне над ѐй, то ў ісламе прырода – ідэал гармоніі, дасканаласці, мудрасці. //Спярша Карана верш, а прымаўкі пасля, // І плынь нехітрых слоў віруе спакваля. // Не варта б іх было б да Бога прамаўляць //Бо сутнасць гэтых слоў нікчэмная, як посчым залаты// [1, с. 35].Адным з касмаганічных вобразаў у паэзіі Абая выступае —ўзыходзячае сонца”, як метафарычная пейзажнасць з нацыянальным і сацыяльным сэнсам. Паэт першым у казахскай літаратуры раскрыў гістарычны і палітычны сэнс паняцца —радзімы” праз успевання любові да роднай зямлі і народа. //

Раскошна сонцу ў вышыні.// Душа, даволі сноў! // Гэй, думка, цеціву напні - // Хай словы мчацца зноў// [2, с. 102].

Абай крытычна ацэньвае маральнае жыццѐ казахаў, раскрывае кансерватыўныя бакі, ўласцівыя іх свядомасці, тлумачыць прычыны іх жывучасці і паказвае шляхі выхаду з гэтага стану. // Ды я падтрымкі не знайшоў, // Ніхто не стаў са мною ўпоруч, //Маіх не ўчуў гарачых слоў, //Не пажадаў мне ў бітве спору//[2, с. 20].Увага паэта не акцэнтавалася на канкрэтных гістарычных падзеях, аўтар свядома выходзіць за межы часавых і прасторавых рамак.Дакладнасць і абмежаванасць ―казахскай прасторы" пастаянна пашыраецца, яна ―цягвае" паступова ў сябе ўвесь сусвет. //А мне ж далі на цэлы век // Імя такое чалавек. //Як званне апраўдаць?// Калі зірну, дык скрозь мана // Плыве махлярства, як туман і праўды не відаць // [2, с. 28]. Смутак у паэзіі Абая спадарожнічае з яго заглыбленымі роздумамі над таямніцамі жыцця і смерці. Праблемы чалавечага быцця выяўляюцца Абаем праз геаграфічную прастору, якая затым паступова трансфармуецца ў яе іншыя формы: а) містычную //Змяняецца лета зімою глухой, //Юнацтва вясѐлыя гульні – тугой, // Калі ты глыбока напеў разумееш, // Размову вядзеш са сваѐю душой [2, с. 107]; б) астральную (касмічную) // Засланіць, перавысіць усіх // Не імкніся, не думай пра тое, - // Сам пацерпіш тады ты ад іх: // У зайздроснікаў – сэрца ліхое [2, с. 24].

Асноўнай прычынай маральных і сацыяльных злыбядаў, на думку Абая, з'яўляецца фанабэрства, сквапнасць, хцівасць чалавека. // Як жа нявечыць нас пыха і франтаўства// Мецяць заўжды яны ў вока, а не ў брыво// [2, с. 24]. А гэта адбываецца з той прычыны, што Усявышні не зрабіў людзей паўнавартнаснымі гаспадарамі зямлі, ѐн толькі паклапаціўся аб тым, каб не пераводзілася ежа, і не магло перапыніцца іх жыццѐ. Абай заўважае вялікую справядлівасць, якая прысутнічае за ўсімі гэтымі дзівоснымі задумамі Усявышняга. Бог не дапусціў таго, каб людзі з-за сваѐй прагавітасці знішчылі ўсіх жывых істотаў і тым самым прынеслі непапраўчую шкоду будучым пакаленнем. Менавіта з-за хцівасці чалавека Алах усемагутны звярам і птушкам для ратавання прыдаў сілу, імклівыя крылы і шпаркія ногі. І ўсе яны існуюць для размнажэння і надзелены невычэрпным інстынктам абароны сваіх

дзяцей. Мудрасць Алаха недасягальна нават мудрэйшым з людзей. Смяротныя ў стане авалодваць магутнасцю ведаў, а сілай усяведання надзелены толькі Алах.

Літаратура
1. Абай. Стэпавы простор. Выбраныя вершы / Абай . – Мінск, 2011.
2. Абай, Кунанбаеў. Выбранае / К. Абай. - Мінск, 1970.
3. Дэкарт, Р. Развагі аб метадзе/ Р. Дэкарт. - Мінск, 2007.

***Терлюкевич И.И., Мушинский Н.И.*** **Восток и Запад: реминисценции Аристотеля в логике Авиценны (Абу Али ибн Сины)**

Рассматривая общие социокультурные тенденции единения народов на евразийском пространстве, следует отметить, что они имеют глубокие исторические корни с точки зрения развития духовной культуры, в том числе логико-философской мысли. Наглядный пример диалога Востока и Запада в истории человечества являют обширные реминисценции Аристотеля (яркого представителя западноевропейского рационализма) в творческом наследии арабоязычных философов 9 – 11 вв. Ближнего Востока и Средней Азии, в частности Авиценны (Абу Али ибн Сины). В условиях древнегреческих полисных демократий 4 – 3 вв.до н.э. (т.н. «классический период», в отличие от более раннего «архаического» (гомеровского, героического), и позднейшего «эллинистического», после походов Александра Македонского), Аристотель в полной мере обобщил и систематизировал принципы зарождающегося научно-технического прогресса, сформулировал логико-философские критерии научного метода, отразил в своих трудах конкретные технические изобретения. «Аристотель… описал принцип… функционирования рычага, винта, … зубчатого колеса… Аристотелевская концепция заключается в различении природного и искусственного в объектах… Между природной и технической (искусственно созданной) формами Аристотель делает различие... Искусственно созданные формы – это результаты деятельности человека, которые опосредуют взаимоотношение человека с природой» [1, с. 92 - 93]. Подобный подход отвечал потребности развития ремѐсел и торговли в древнегреческих